Отдушина

Просто хорошая газета!

МАССОВО-ПОЛИТИЧЕСКАЯ ГАЗЕТА

Издатель УП "Газета Слонімская" | Выходит один раз в неделю | Основана 18 октября 2002 года

№4 (333) | 19 января 2011 года



КАЛЯДНЫЯ СУСТРЭЧЫ



Леанарда Юргілевіч: «Гэта не праца, а маё шчасце!»

Калі Леанарда Станіславаўна наведвае нашу рэдакцыю, то здаецца, яе шчырая ўсмешка асвятляе ўсё навокал. Энергічная, прыветная, модна і з густам апранутая, гэтая жанчына выглядае заўсёды прывабна і элегантна.

Чытачам "Газеты Слонімскай" і "Аддушыны" спадарыня Леанарда вядома ў першую чаргу як аўтарка жыццёвых гісторый, апавяданняў, фельетонаў і гумарэсак.

Сёння Леанарда Юргілевіч — госця калядных сустрэч "Аддушыны".

— Леанарда Станіславаўна, многія нашы чытачы цікавяцца, калі нарэшце выйдзе Ваша кніга апавяданняў?

— Бадай, ніколі. У мяне няма ні ўласных сродкаў, ні спонсара, каб выдаць зборнік.

— Нешта мы пачалі размову з сумнага. У Вас жа напісана твораў не на адну кнігу.

— Тое, што друкавалася раней, на жаль, я не захоўвала ў дамашнім архіве. Але ў мяне многа новых фельетонаў, апавяданняў, жыццёвых гісторый. Хацелася б, вядома, выдаць хоць бы адну кнігу.

— Будзем спадзявацца, што спонсар, які дапаможа Вам выдаць зборнік, усё ж з'явіцца. Зараз раскажыце, як Вам працавалася журналістам?

— Гэта была не праца, а маё шчасце! З сямнаццаці гадоў я працавала ў Дзятлаўскай раённай газеце "Перамога". Спачатку была літсупрацоўнікам, потым карэспандэнтам, загадчыкам аддзела пісем і, нарэшце, загадчыкам аддзела сацыяльных праблем. Я не любіла выхадных, водпускаў. У мяне была пільная патрэба — пісаць. Іншы раз бывала і так, што садзілася за друкарскую машынку, калі не было ні тэмы, ні загалоўка. Аднак мне як быццам нехта дыктаваў — прыходзіла тэма, прыдумваўся загаловак. Гэта мне самой было дзіўна. Да таго ж у мяне ніколі не бывае чарнавікоў.

— Многа разоў Вы станавіліся пераможцай літаратурных конкурсаў. А з якога часу пачалі пісаць у жанры апавядання?

— Апавяданні таксама стала пісаць даўно. Маю першую гумарэску надрукаваў часопіс "Вожык", калі я вучылася яшчэ ў школе.

— Іншы раз, чытаючы некаторыя Вашы апавяданні, разумееш, што Вы проста не маглі пра гэта не напісаць.

— Бывае, нешта вельмі доўга выношваю ў сваёй душы, разважаю, пісаць пра гэта ці не. Ёсць у мяне і такія выпакутаваныя гісторыі. Думаеш і мучышся: і пісаць пра гэта няёмка, а не напісаць — яшчэ горш. Здараецца, што і вітацца са мной знаёмыя перастаюць, калі пазнаюць сябе ў жыццёвых гісторыях... А некаторыя не могуць дараваць мне за фельетоны, надрукаваныя некалькі дзясяткаў гадоў таму. Прыходзіцца пераступаць і цераз гэта, каб іншыя людзі не былі такія жорсткія і задумваліся пра сапраўдныя каштоўнасці жыцця.



Леанарда Юргілевіч

— Нейкімі сакрэтамі сваёй творчай кухні Вы падзеліцеся з чытачамі?

— Асаблівых сакрэтаў няма. Адкуль бяруцца сюжэты, я іншы раз і сама дакладна не ведаю. Нешта запазычваю з жыцця сваіх блізкіх і далёкіх знаёмых. Пры гэтым узнікаюць нейкія асацыяцыі і нараджаюцца пэўныя вобразы.

— Цяпер папулярнасцю карыстаюцца гісторыі са шчаслівым канцом. Вы ж не абмінаеце тэму людскога гора, і большасць Вашых твораў маюць трагічны канец.



Працяг на стар. 2



Леанарда Юргілевіч: «Гэта не праца, а маё шчасце!»

Працяг
Пачатак на стар 1

—Чалавек на свет нараджаецца на мукі, і ён павінен пакутаваць. Бог чалавеку пасылае выпрабаванні і назірае, ці спраўляецца ён, ці нясе свой крыж дастойна. Калі ты свой крыж паспрабуеш скінуць, Бог табе яшчэ адзін дасць. І ты будзеш усё роўна несці той крыж, які табе наканаваны.

—Каму асабліва нялёгка прыходзіцца ў нашых рэаліях?

—Калі ў чалавека ёсць здольнасць думаць, калі ён умее разважаць і аналізаваць, то яму нялёгка жывецца ў сучасным свеце. Але жыць трэба. І трэба жыць на радзіме.

—А якія пачуцці ў Вас выклікае радзіма?

—Я не змагла б нідзе жыць, акрамя як на радзіме. Калі мне прыходзілася выязджаць у другую краіну, я не магла дачакацца, пакуль буду вяртацца дамоў. І калі пераязджала мяжу і бачыла родныя прасторы, мне станавілася лёгка на душы: я дома!

—Сёння мы мала гаворым пра такія паняцці, як радзіма, чалавечая годнасць, бескарыслівасць. Усе вырашаюць найперш свае матэрыяльныя, грашовыя праблемы. А якія, на Вашу думку, духоўныя праблемы патрабавалася б нашым людзям вырашыць найперш?

— Чалавек найперш павінен бачыць не тое, чаго яму не хапае. Спачатку трэба паглядзець, хто вакол цябе жыве і хто як пакутуе. Добра чалавеку — трэба за яго радавацца, а не яму зайздросціць. Дрэнна некаму — значыць, трэба дапамагчы.

—Вы пішаце заўсёды на роднай мове. Некаторы час таму газета надрукавала Ваша апавяданне на цудоўнай рускай мове. Якія адносіны склаліся ў Вас з мовамі?

—Я вельмі люблю родную мову, таму што гэта такая сакавітая, такая багатая мова! Гумарыстычныя апавяданні, напрыклад, я пішу заўсёды на беларускай мове. На ёй скажаш так выразна і ёмка, як ніколі не скажаш па-руску. І па-беларуску не заўсёды зможаш выказацца так, як зробіш гэта па-руску. Я люблю і беларускую, і рускую мову і не ведаю нават, якую з іх больш.

—Каго з пісьменнікаў перачытвалі не раз?

—Люблю Чэхава, ён для мяне родная душа. Яго апавяданне "Злоумышленник" ведаю ці не на памяць. З сучасных рускіх пісьменнікаў уражвае Валянцін Распуцін. З беларускіх люблю Якуба Коласа, асабліва захапляе яго "Новая зямля". Проста на душу кладуцца вершы Ніла Гілевіча і Алеся Пісьмянкова.

—А які Ваш самы любімы знак прыпынку?

—Шматкроп'е. Яно прадугледжвае працяг і думкі, і жыцця, і творчасці...

—Калі Леанарда Юргілевіч не піша, чым яна займае свой вольны час?

—Прыходзіцца займацца іншай прозай жыцця — сваёй гаспадаркай, агародам і кветнікам.

—Як ставяцца да Вашай творчасці родныя?

—Вядома, ухваляюць мой творчы занятак. Ім падабаецца тое, што пішу. Мае дзеці — сын і дачка — даўно дарослыя і маюць свае сем'і. У нас з мужам трое цудоўных унукаў.

—Кажуць, што імя можа ўплываць на жыццё чалавека. Леанарда ў перакладзе азначае "моцная, дужая". Нейкім чынам імя прадвызначыла Ваш лёс?

—Магчыма, у нейкай ступені так. Усё жыццё мацуюся і імкнуся быць дужай.

—А што Вам дапамагае быць моцнай?

—Моцы мне надае вера. Без Бога мне не хапіла б мужнасці пераадольваць жыццёвыя выпрабаванні. А іх шмат.

—Што Вам хацелася б сказаць сваім чытачам?

—Тое, што я іх люблю і ўдзячна ім за тое, што яны мяне чытаюць. Гэта мяне натхняе і дапамагае мне жыць. Жадаю ўсім моцнага здароўя!

—Леанарда Станіславаўна, мы таксама жадаем Вам добрага здароўя і творчага натхнення. І ў канцы нашай размовы паставім не кропку, а шматкроп'е — з надзеяй на тое, што Вы і надалей будзеце радаваць чытачоў сваёй творчасцю...

Жанна ПЛЕШКО
Фота Кацярыны ЯНУШЭВІЧ

Путь к Богу

Поведение в храме



Священник Павел Франтищик, кандидат богословия

Дорогие друзья! В этом году в нашей рубрике «Путь к Богу» я постараюсь рассказать вам о самых элементарных церковных вещах и понятиях, с которыми большинству из вас придется столкнуться в жизни. И первой нашей темой будет понятие о храме и поведение в нем.

Православный храм — это место особенного присутствия Бога на земле. Всякий раз, когда мы идем в храм, мы должны входить в него как в дом Божий, со страхом и благоговением. Все житейские проблемы и бытовую суету нужно оставить перед порогом церкви, стараясь, насколько возможно, успокоить буйные помыслы своего сердца.

Вести себя в храме нужно благоговейно, так, чтобы не оскорбить величие святыни, не навлечь на себя гнев Божий. Посещать богослужения необходимо как минимум раз в неделю, согласно заповеди Господней: шесть дней делай, день седьмой — посвящай Богу.

Приходить к службе надо заблаговременно, за 5-10 минут до начала богослужения. Входя, нужно трижды перекреститься и сделать поклон со словами: «Боже, очисти меня, грешного, и помилуй меня». При входе в храм мужчины снимают головные уборы. Женщины входят в храм с покрытой головой. Если женщина пришла с накрашенными губами, то ей необходимо стереть губную помаду. Одежда должна быть пристойной и опрятной.



В храме нельзя говорить громким голосом, держать руки в карманах, жевать резинку. Стоя на своем месте, не следует вертеться, оглядываться, шуметь, разговаривать с ближними, а нужно с вниманием слушать чтение и пение церковное. По сложившейся древней практике мужчины стоят в правой части храма, а женщины в левой. Без нужды не следует ходить по храму. Ставить свечи и прикладываться к иконам нужно так, чтобы не помешать другим молящимся. Разговоры в храме нужно ограничить до предела. Знакомых кратко поприветствовать, отложив беседы на потом.

Придя в храм с детьми, нельзя позволять им бегать и шалить. Плачущего ребенка нужно постараться успокоить, если это не удается, следует выйти с ребенком из храма. Подпевать хору во время богослужения можно только тогда, когда на это укажут священнослужители. Сидеть в храме дозволяется только по причине болезни или сильного утомления. Также нельзя сидеть, закинув ногу на ногу.

Если все молящиеся встают на колени, нужно присоединиться к ним.

На церковном крыльце нельзя курить. Нельзя входить в храм с животными или птицами. Недопустимо ходить и разговаривать во время чтения Евангелия, пения «Херувимской» песни и Евхаристического канона на Литургии (от Символа Веры до молитвы «Отче наш»). В это время также нежелательно ставить свечи и прикладываться к иконам. Сделать замечание ближнему, который нарушил правила благоповедения, нужно негромко и деликатно. Лучше вообще воздержаться от замечаний, если, конечно, не имеет места наглое, хулиганское действие.

Наконец, нужно оставаться в церкви до полного окончания богослужения. Уходить раньше времени можно лишь по немощи или серьезной необходимости.

17.01.2011

Продолжение следует

Свои вопросы и пожелания читатели "Отдушины" могут адресовать кандидату богословия священнику Павлу Франтищику по адресу: **231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, с пометкой «Путь к Богу», или звоните по тел. 3-60-60, или присылайте SMS-сообщения на тел. (8-029) 133-04-21.**

Советы

Предметы, опасные для здоровья



«ЛИЧНЫЕ ДЕНЬГИ»

Нам с самого детства пытались вложить в голову, что, придя с улицы, надо обязательно мыть руки. Причем с мылом. Причем не важно, садитесь ли вы сразу по приходе домой за стол есть или даже в случае, если трапеза у вас в ближайшее время не предусмотрена. За своими детьми мы в этом отношении следим строго. А вот сами? Всегда ли вы после прихода домой моете руки? Правило, гласящее о том, что эти части нашего тела надо обязательно подвергать помывке после посещения общественных туалетов, большинство из нас, скорее всего, усвоило твердо. А вот то, что неплохо бы проделать эту процедуру особенно тщательно после того, как вы прибегли к помощи банкомата, большинство, скорее всего, и не знает.

А между тем эти аппараты могут представлять для нашего с вами здоровья достаточно серьезную опасность. Бактериальную угрозу для человека несут также уличные телефоны-автоматы и остановки общественного транспорта. Небезопасно с точки зрения здоровья также сидеть в автобусах или пользоваться возможностью присесть на сиденья, которые расположены в метрополитене.

Так чем же так опасны банкоматы? Западные ученые предупреждают: на их кнопках содержится столько же бактерий, что и в общественных туалетах. Вследствие этого при прикосновении к аппаратам для выдачи наличных денег достаточно велик риск подцепить опасную кишечную инфекцию. Это значит, что, снимая деньги с карты или оплачивая какие-либо услуги при помощи банкоматов, мы рискуем заработать себе такие, например, серьезные неприятности, как диарея и прочие желудочно-кишечные недуги.

В связи с этим микробиологи из британской компании BioCote предупреждают: с точки зрения количества болезнетворных бактерий аппараты для приема и выдачи дензнаков во многом опаснее общественных туалетов. Такие данные исследования были обнародованы в The Telegraph.

Прежде чем сделать такие выводы, эксперты провели тщательные лабораторные исследования. Они взяли пробы с поверхности клавиатуры банкоматов, расположенных в крупнейших торговых центрах Великобритании, которые ежедневно посещают тысячи покупателей.

Аналогичные мазки были взяты с сидений одних из самых грязных, как принято традиционно считать, мест — с поверхности сантехники, которая находится в общественных туалетах. Все образцы подверглись внимательному изучению под микроскопом в специальных лабораториях.

Чтобы оценить степень заражения, все пробы были оставлены в лабораторных условиях на ночь. Это позволило выявить в исследуемых материалах такие опасные бактерии, как псевдомонады и бациллы, провоцирующие расстройство желудочно-кишечного тракта. Причем эти бактерии и в туалете, и на кнопках банкомата содержались в одинаковой степени.

Результаты исследований удивили самих ученых. "Мы были удивлены полученными результатами, потому что исследования показали, что банкоматы загрязнены бактериями в большой степени, чем соседние общественные туалеты. В то же время бактерии, которые были обнаружены на торговых автоматах, были подобны тем, что обитают в туалетах и провоцируют общечеловеческие болезни», — заявил микробиолог Ричард Гастингс.

Между тем только исследованиями банкоматов эксперты лаборатории BioCote не ограничились и обнародовали обзор самых грязных, с точки зрения простых граждан, мест в Великобритании. На удивление, лидирующие строчки рейтинга опасных для здоровья мест занимают не только общественные туалеты. Исследования, проведенные среди 3 000 взрослых, показали, что самый большой риск для здоровья, по мнению британцев, представляют также общественные телефоны. В списке опасных для здоровья мест они расположились на второй строчке. Таким образом, им досталась почетная «бронза». Согласно результатам анкетирования, на третье место жители Англии поставили автобусные остановки.

Пыльная и грязная среда станций и вагонов Лондонского метрополитена занимает в рейтинге «античистоты» четвертое место.

Пассажирским местам в британских автобусах, поражающих своей антисанитарией, отведена пятая строчка. Следом идут места в трамвае и метро.

Под номером семь в десятке самых опасных для здоровья мест идут банкоматы.

Восьмое место досталось вокзалам, которые напрямую связаны со спальными местами и сиденьями в поездах, в которых также вряд ли присутствуют стерильные санитарные условия. Именно поэтому им досталась девятая строчка.

Почетное десятое место в списке самых бактериально опасных мест британцы отдали клавиатуре платежных терминалов и кнопкам, которые приходится нажимать при оплате покупок кредитными картами.

Надо заметить, что британцы всерьез обеспокоены проблемой грязи и их пугает сама вероятность того, что в общественных местах можно подцепить какую-нибудь заразу. В связи с этим почти половина жителей Англии (то есть 48%, или около 23 миллиона взрослых) избегает пользоваться уличными телефонами, потому что считает их грязными, 42% британцев признались, что зачастую по этой же причине не пользуются банкоматами, а 35% старается вообще не ездить в общественном транспорте. Те же, кто не может позволить себе подобной роскоши, старается по возможности как-то обезопасить себя от заражения.

Методы, надо сказать, у каждого свои и, прямо скажем, крайне сомнительны. Так, почти каждый десятый регулярно протирает сиденье или стелет себе что-нибудь под попу перед тем, как сесть в транспорте. Вряд ли это спасет их от микробов, однако благодаря этому достигается психологический эффект: он вселяет в души людей некое спокойствие перед лицом бактериальной опасности.

По материалам Интернета

Новости медицины

УЧЁНЫЕ ПЫТАЮТСЯ СОЗДАТЬ ТАБЛЕТКУ ЛЮБВИ

Ученые уже начинают работать над препаратом, который поможет людям испытывать более сильные чувства к противоположному полу.

Американские ученые в ближайшем будущем выпустят волшебную таблетку любви, которая бы помогала людям увеличивать или уменьшать чувства к противоположной стати.

Ученые убеждены, что действие препарата вполне прозаично и соответствует физиологии человека. Не будет неразделенной любви, значительно сократится круг одиноких людей, начнется новая эра. «Таблетка любви» сможет воздействовать на определенный участок мозга, который отвечает за чувство влечения. Мужчины-изменщики перестанут гулять на стороне, а потускневшие отношения обретут новую жизнь. Согласитесь, есть некоторые плюсы в такой «химии».

Vrach.TV

ОТ ЧЕГО ПОГИБАЮТ АЛКОГОЛИКИ?

Известно, что алкоголь выводится из организма в течение 1-2 суток (в зависимости от дозировки). Однако он не просто побыл и через сутки вышел… Есть еще и продукты его полураспада, запускающие различные неблагоприятные механизмы. А потому реакция организма на алкоголь может продолжаться далеко не два дня.

Например, «белая горячка» возникает, когда алкоголя в организме может и не быть – через 2-3 суток после серьезного и достаточно длительного периода злоупотребления. В общем же, каждый алкоголик буквально за несколько лет чрезмерного употребления алкоголя приобретает примерно 4-5 хронических заболеваний, таких как алкогольная, или токсическая зависимость, миокардиодистрофия, алкогольная жировая дистрофия, острый или хронический панкреатит, трофические язвы, алкогольный полиневрит, или алкогольная полинейропатия.

Конечно, время от времени недуги дают о себе знать, однако зачастую на них обращают внимание в последнюю очередь. В итоге больной алкоголизмом погибает не от пьянства как такового, а от соматических заболеваний и патологических состояний, спровоцированных чрезмерным употреблением алкогольных напитков.

Medicina.ua

НАСТОЙ ИЗ КУРАГИ СПАСЁТ ОТ ОТЁЧНОСТИ НОГ



Отёк — это скопление избыточного количества жидкости в тканях. Причины, по которым отекают ноги, могут быть самыми разными…

От этой напасти помогает курага: залить 50 г сухофруктов стаканом кипятка, настаивать 3-4 часа, процедить и принимать по полстакана 2 раза в день. Помогает отменно!

Комментирует Вера Кукарцева, врач-терапевт высшей категории:

— Курага обладает мочегонным действием и поэтому используется при многих заболеваниях, сопровождающихся отёками, — обычно это болезни почек, печени и сердечно-сосудистой системы. Зимой компот из кураги особенно полезен. Ведь высушенный абрикос — кладезь калия, каротина, фосфора, кальция, железа, витамина В5, а содержащиеся в кураге пектины нормализуют работу желудочно-кишечного тракта. Однако отёки часто — признак серьёзного заболевания, важно выяснить их причину и пройти соответствующий курс лечения.

Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК

Валентин Григорьев:

«Если бы у меня была такая возможность, то я бы пошёл ещё учиться...»


За рабочим столом

За свою жизнь у Валентина Григорьева было много увлечений. Поначалу он собирал почтовые марки с изображением живописи. Затем увлекся нумизматикой. Собрал большую коллекцию старинных монет. Около шестнадцати килограммов чистого серебра составляли монеты коллекции Валентина Сергеевича. Через руки этого человека прошло много интересных археологических находок.

Валентин Сергеевич окончил в свое время Минский институт культуры, приобрел специальность «методика и организация клубной работы», был депутатом поселкового совета, два раза его избирали секретарем комсомольской организации. Теперь ему 63 года, живет в деревне Жировичи. У него большая семья, девять детей.

Корреспонденты «Отдушины» побывали в гостях у Валентина Сергеевича. В первую очередь в его доме внимание привлекли картины.

— Валентин Сергеевич, Вы увлекаетесь живописью?

— До недавнего времени увлекался. Начну все с самого начала. Моя мать по происхождению была из княжеского рода Косинских. Отца я своего не знал. Когда повзрослел, мне удалось узнать немного о своем отце. Он был заслуженным художником СССР, учеником М. Шагала и Рериха. Вот, наверное, у меня гены сработали, и меня потянуло к живописи. Я пишу маслом. Идеи для своих картин беру из старых фотографий и открыток. Это занятие больше для души. У меня не много работ. Часть из них я раздарил. К примеру, две мои работы я подарил лоротделению госпиталя МВД, когда проходил там лечение.

— Вы сказали, до недавнего времени увлекались, а почему сейчас не пишете картины?

— Года три назад это было. На определенной стадии написания картины необходимо ставить для просыхания в помещение нужной температуры. Так вот, эта картина называлась «Букет цветов». Поставил я ее для просыхания. А детишки добрались до моей работы. Им же интересно все потрогать. Они всю картину исполосовали своими ручонками. Испортили всю картину и сами перепачкались. Я как это все увидел, у меня сердце сжалось. Теперь меня тянет к живописи, но руки не поднимаются. Целый месяц я работал над этой картиной, а тут раз и все. Остался еще в душе осадок.

— Валентин Сергеевич, Ваши работы помещены в красивые массивные рамки. Вы их сами изготовили?

— Нет. По моей просьбе сотрудники Жировичского монастыря привозили под заказ заготовки для рамок. Затем по размерам моих работ их распиливали и делали рамки.

— Скажите, чем Вы еще занимаетесь?

— Всю свою жизнь меня интересовали археологические находки. Если бы у меня была такая возможность, то я бы пошел еще учиться на факультет археологии или географии. У меня есть такие вещи, которым, по предположениям, более 250 миллионов лет. Среди них фрагменты костей динозавров, зуб динозавра, останки скелетов различных животных, метеоритные осадки, окаменелая икра. Кроме того, есть старое панское клеймо по дереву с инициалами, боевой чекан — топор из метеоритов, черепки старинной посуды, тяпки своеобразных форм кузнечной сварки, гвозди квадратной формы, лейбла от панского дома 1939 года, княжеские вилки и ложки и многое другое.



— Валентин Сергеевич, может, это просто Ваши предположения, а на самом деле все эти предметы не имеют никакой исторической ценности?

— Я уверен, что имеют. Я неоднократно возил свой арсенал в минский БГУ на географический факультет. Научные сотрудники склонны считать, что все собранные мною предметы имеют историческую ценность. Но для более точного заявления об этом необходимо провести ряд дорогостоящих анализов, кучу волокитных бумажных работ, чем на данный момент я и озадачен. У меня имеется много научной литературы. Научные журналы и книги беру в библиотеках. Мне очень интересно все, что связано с географией и археологией.

— Скажите, а Ваши увлечения разделяют Ваши близкие?

— Все до одного. Моя жена меня всячески поддерживает и мне помогает. Детишки со мной всегда ходят на карьер за находками. Бывает такое, что принесут из садика какие-то камушки, которым не придаешь значения. А оказывается, это не просто камушки, а находка для археолога. Мы всей семьей увлечены. У нас дружная и крепкая семья.

Такие необычные увлечения у семьи Григорьевых. Посудите, ведь какое бы ни было увлечение, а жить с ним намного интересней.

Екатерина ГЕРАСИМЧИК
Фото автора





Работы Валентина Григорьева

Очумелые ручки

От редакции:

Напоминаем, что в газете «Отдушина» открылась новая рубрика «Очумелые ручки». В связи с этим предлагаем читателям нашей газеты — от мала до велика — стать её участником. Любой может поделиться с читателями своими поделками из бумаги, пластмассы и других подручных вещей. А главное, что все самоделки могут быть полезными в жизненном обиходе.

О своих поделках вы можете прислать рассказ по адресу: **231791, Слоним, ул. Красноармейская, 41, либо рассказать нашему репортеру по телефону: 3-60-60, и он навестит вас, чтобы рассказать на страницах газеты о вашем мастерстве.**



ВІКТАРЫНА

“МАЯ РАДЗІМА — БЕЛАРУСЬ”

I тур

Пра каго так сказана?

Заданне 1

Яе аднолькава шануюць у Беларусі і праваслаўныя, і католікі. У “Малітве за беларускі народ” ёсць і такія словы: “Цябе, Прачыстая Багародзіца і наша нябесная Маці, просім: прычыніся за намі, а Ты, святая ... — патронка Беларусі — ды ўсе святыя заступнікі Беларускага Народу, апякуйцеся намі, каб мы сталі народам святым, выконваючым Волю Божую і сваё пасланства...”.

Сябры! Станавіцеся ўдзельнікамі віктарыны “Мая Радзіма — Беларусь”.

Прысылайце свае варыянты адказу ў SMS-паведамленні на нумар (8 029) 133-04-21 да 23 студзеня.

За кожны правільны адказ вы будзеце атрымліваць па 1 бале. Пераможцам віктарыны стане той, хто набярэ найбольшую колькасць балаў.

Удзельнічайце і перамагайце!

ИРА БОБРОВСКАЯ СТАЛА ЛАУРЕАТОМ КОНКУРСА «РОЖДЕСТВО ХРИСТОВО»



Гитара — любимый инструмент Иры

ФОТО ТАТЬЯНЫ ПЛАХЕТКО

В дни рождественских праздников в белорусской столице состоялся Первый Минский открытый конкурс исполнителей на народных инструментах «Рождество Христово». Лауреатом этого музыкального конкурса стала юная слонимчанка Ира Бобровская.

Ира занимается в четвертом классе Слонимской школы искусств по классу гитары у преподавателя Дмитрия Новгородского. Два года тому назад юная гитаристка стала лауреатом областного конкурса имени Горского, на котором заняла третье место.

На своем любимом музыкальном инструменте Ира исполняет классическую музыку, испанскую и джазовую. Она выступала в школьных концертах и на сцене районного Дома культуры. Ира признается, что ей нравится выступать на сцене, и считает, что на фестивале-конкурсе в Минске она выступила достойно. Ведь такой интересный инструмент — гитару — она выбрала сама. А желание играть, отмечает Ира, у нее не пропадает никогда.

Впереди у Иры Бобровской — много музыкальных конкурсов. Пожелаем ей успеха и творческих достижений!

РАЗЛОЖИ НА СЛОВА



Попробуйте разложить предложенное слово на два других так, как показано в первом примере. Каждая буква должна быть использована по одному разу.

ТРОЙКА



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Вова сядзіць за сталом і старанна выводзіць літары.

“Скрып-рып”, — ледзь чутна рыпіць пяро, і на паперы з'яўляюцца значкі: зграбныя, роўныя, адзін у адзін. Вось гэта, што шырока расставіла ногі, — “м”. Калі напісаць “м”, а да яго прыставіць “а”, то выйдзе “ма”. А калі злучыць такія два склады, то выйдзе слова “мама”.

Вова глядзіць на яго, любуецца: то з аднаго боку зірне, то з другога.

Вельмі добра выйшла. Мама дзесятку паставіць. Яна настаўніца іхняга класа. Ганарыцца ёю Вова. Яна самая-самая добрая, разумная.

Што яго мама самая разумная, Вова з любым можа паспрачацца. Гэтак і тата кажа, і нават Пецька, які з ім, Вовам, у адным класе вучыцца.

Пяро піша далей: “Мама любіць Алеся”.

І трэба ж было такому здарыцца! Самая апошняя літара “я” пералезла за чырвоную лінію і выйшла зусім непрыгожая. Нейкая скрыўленая. Быццам яе хтосьці спалохаў ці нават прыплюснуў.

Вова паглядзеў на сваю вольніцу-літару і хацеў перапісаць увесь сказ нанава, але зірнуў на гадзіннік і ўбачыў, што меншая стрэлка набліжаецца да лічбы “2”, а большая стаіць на лічбе “8”.

Зараз будзе дзве гадзіны, хутка ўрокі пачнуцца. Мама сёння пайшла раней, сказала, каб ён не спазніўся.

Вова загарнуў старонку, паклаў сшытак у партфель і пабег у школу. А ўвечары мама правярала сшыткі. Вова сядзеў насупраць на канапе. Закрыўшыся кнігай “З рога ўсяго многа”, ён цікаваў за стосам сшыткаў. Вунь і ягоны сшытак у сіняй вокладцы зверху ляжыць. Што яму паставіць мама?

Мама ўзяла сшытак у рукі, разгарнула. Бачыць Вова: нахмурылася і вывела... тройку. Не вытрываў ён і прагаварыў:

— Хоць чацвёрку паставіла б. Шкада табе, ці што?


— Другі раз акуратна напішаш — пастаўлю дзясятку, — адказала мама.

Аляксей ЯКІМОВІЧ

ГОЛОВОЛОМКА

РАЗДЕЛИТЕ ФИГУРУ НА РАВНЫЕ ЧАСТИ

Попробуйте разделить данную фигуру ломаными линиями на три одинаковые части.



ФИЛВОРД «РОДСТВЕННИКИ»

В	Е	Л	О	З	Я	К	Ш
Е	Д	О	С	В	О	Р	У
Р	К	В	Т	Ь	В	И	С
Ь	А	С	Е	Щ	О	Н	В
К	Е	В	П	А	Р	К	Е
О	Р	Е	Л	З	Х	А	Т
Н	Я	М	Т	Я	О	Ь	Е
Н	И	К	Ь	С	Н	Т	С

Найдите в сплетении букв слова по заданной теме.

Слова могут «ломаться», но только под прямым углом.

Все буквы должны быть вычеркнуты.

Страницу подготовила Жанна ПЛЕШКО

Споведзь

Халодны дождж

“Не шукай біду, яна цябе сама знойдзе” — гэтая прыказка нібы спецыяльна пра мяне.

Сонечным лютаўскім днём, калі зіма ўжо, можна сказаць, павярнула на вясну, мой муж атрымаў вытворчую траўму. І як дактары ні стараліся выратаваць яго нагу, нічога не атрымлівалася. Праз нейкі час у Рамана пачалася гангрэна, а потым сэпсіс. І размова ўжо ішла пра выратаванне жыцця, бо яно, што называецца, вісела на валаску. У тыя страшныя, цяжкія дні я не магла ні спаць, ні есці. Даведаўшыся, што мужу будуць ампутаваць нагу, лічы, не выходзіла з бальніцы. І потым, пасля аперацыі, суткамі праседжвала каля яго пасцелі, старалася выканаць кожнае жаданне, што называецца, любы капрыз. Дыгэта і зразумела: мы толькі пажаніліся, нам было ўсяго па дваццаць тры гады.

У палату да нас часта заходзіў малады доктар Вадзім Сяргеевіч. Ён не лячыў мужа, проста вельмі спачуваў нашаму гору і ўсяляк стараўся падтрымаць добрым, спагадлівым словам, парадай. Я ведала, што Вадзім Сяргеевіч у нашай бальніцы працуе нядаўна, што яго накіравалі сюды пасля сканчэння медыцынскага інстытута.

Аднойчы, калі мужа ўжо збіраліся выпісваць дадому, бо ён мог самастойна хадзіць на мыліцах, малады доктар сустрэў мяне ў бальнічным калідоры. Быў вечар, але ён заставаўся тут, бо дзяжурыў.

—Ты, Аня, ці ўяўляеш, якое жыццё чакае цябе з бязногім калекам? — спытаў, з жалем гледзячы ў вочы.

—Што б там ні чакала, усё перажыву… Галоўнае, што яго выратавалі.

—Хоць бы ён ацаніў тваю адданасць і дапамогу…

—Хіба гэта галоўнае?

—Не галоўнае, канешне, але вельмі важнае. Калі будзе вельмі цяжка, можаш заўсёды разлічваць на маю дапамогу. Дзе мяне цяпер знайсці — ведаеш. Але я тут доўга затрымлівацца не збіраюся. Адпрацую, колькі належыць па законе, і паеду, бо якія перспектывы ў маладога спецыяліста ў невялікім раённым гарадку? Так што пакіну табе тэлефон і адрас маіх бацькоў, яны падкажуць, дзе мяне шукаць.

Ён падаў мне лісток, пацiснуў руку:

—Ну, і малайчына ты. Такой і заставайся. Шкада, што мы не сустрэліся раней…

Я, шчыра прызнацца, неўзабаве таксама пашкадавала аб гэтым. І не таму, што цяжка было жыць з бязногім калекам, а таму, што памяць услужліва нагадвала і яго спакойны, чароўны голас, і цёмныя, напоўненыя пяшчотай вочы, і цяплo рукі, якой ён толькі аднойчы дакрануўся да маёй… Ды што з тых успамінаў? Мне быў наканаваны іншы лёс.

Муж, калі выпісаўся з бальніцы, стаў злосным і агрэсіўным, беспадстаўная глухая рэўнасць нападала на яго, як напаўняе мутная вада лужыны пасля дажджу. Чаму з работы прыйшла на некалькі мінут пазней? Чаму купіла сабе новую сукенку? Навошта зрабіла модную стрыжку? І такія недарэчныя пытанні сыпаліся на мяне ледзь не кожны дзень, як бульба з дзіравага кошыка. Сам жа Раман апусціўся, пачаў часта прыкладацца да чаркі, звязаўся з такімі жыхарамі нашага двара, якіх раней абыходзіў дзясятай дарогай. А тыя, асушыўшы бутэльку-другую, што называецца, вучылі яго жыць, бо дзяліўся з гэтымі апойкамі сваімі думкамі і сумненнямі.

—Біць яе трэба, волю надта ўзяла, — раілі яны. — Спытай як след, для каго прыбіраецца.

І ён “пытаў”. Часта, вярнуўшыся дадому з такіх папоек, пускаў у ход кулакі. Я цярпела, бо вельмі яму спачувала, ведала, што душу Рамана напаўняюць крыўда на лёс, злосць, што ён калека, што не такі, як усе наўкола. Але я ў чым жа вінавата?

Калі навучыўся хадзіць на пратэзе, у арганізацыі, дзе атрымаў вытворчую траўму, далі яму другую работу. Але новая справа давалася цяжка, і ён стаў яшчэ больш злосным, агрэсіўным.

Мінулі гады, дзесяцігоддзі. Жылі мы як у нейкім замкнутым коле: работа, дом. Ні мы да людзей ніколі не хадзілі, ні людзі да нас. Нават нешматлікая радня забылася наш адрас. Іх няцяжка зразумець: людзі стараюцца далей трымацца ад хворых і калек. Дзіўныя… Нібыта самі застрахаваны ад гэтага, нібыта ў любы момант на месцы Рамана не можа аказацца кожны.

Усю крыўду на лёс Раман па-ранейшаму выліваў на мяне. Пасля чарговых пабояў не раз думала: кіну, пайду куды вочы глядзяць. Хоць пад старасць пажыву спакойна. Не раз парывалася пазваніць бацькам Вадзіма Сяргеевіча, спытаць, як склаўся яго лёс. Але гэтыя думкі як прыходзілі, так і сыходзілі, саступаючы месца іншым: “А як жа Раман? Калі кіну, то каму ён будзе патрэбны? Сап’ецца зусім, прападзе”.



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Аднойчы ў нашага начальніка быў юбілей, і ён запрасіў усіх супрацоўнікаў у рэстаран. Я доўга думала, ісці ці не ісці, падзялілася сваімі сумненнямі з сяброўкай.

—Дурніца, яна яшчэ разважае! Канешне ісці. Колькі ты над сваім Раманам сядзела, колькі слёз праліла, а чым ён плаціць? Сінякамі. Падумай пра сябе. Ты ж яшчэ не старая, а ходзіш вечна сумная, горам прыбітая. Паглядзі на свет іншымі вачамі.

—Біцца будзе, як даведаецца.

—А так хіба не будзе? Ні за гэта, то за што-небудзь іншае. Прыдумае за што. У яго на гэта хопіць фантазіі.

І я пайшла. Раману нічога не сказала, бо ён не пусціў бы. Проста калі пасля работы ўсе накіраваліся ў рэстаран, пайшла разам. І сапраўды, нібыта ў іншы свет трапіла: весялілася, танцавала, жартавала. Нават сама сябе не пазнавала. Але раз-пораз уніклала думка: за ўсё гэта дома прыйдзецца расплачвацца.

Так яно і атрымалася. Пакуль я весялілася ў рэстаране, добразычліўцы ўжо данеслі гэтую вестку мужу, і таму, яшчэ не паспеўшы пераступіць парог кватэры, атрымала такі ўдар гантэллю па руцэ, што адляцела назад на лесвічную пляцоўку. Правая рука павісла вяроўкай. Праз дзікі боль чула, як Раман зачыніў дзверы на ключ.

Я зайшла да суседкі, і тая выклікала хуткую дапамогу.

Косці былі так раздробленыя, што мясцовыя хірургі нават не ўзяліся апераваць. Абязболіўшы, адразу павезлі ў абласную бальніцу. Гэты выпадак падзейнічаў на мяне як халодны дождж: “Я ж для Рамана проста служанка. Столькі гадоў даглядала, была вернай і адданай, патурала яго эгаізму. Сапраўды, дурніца…”

Калі пасля аперацыі ў абласной бальніцы адышла ад наркозу, убачыла, як над маім ложкам схіліўся пажылы доктар:

—Ачуняла, гаротніца?

Дзе я чула гэты ласкавы голас? Дзе бачыла добрыя, поўныя спагады вочы?

—Вадзім Сяргеевіч?! — працяла здагадка.

—А ты думала, схавалася ад мяне назаўсёды? Я цікавіўся табой, ведаю ўсё пра тваё жыццё. Цяпер не адпушчу на здзекі. Калі ёсць на тым свеце пекла, то ты ўжо адпеклавала на гэтым…

Да Рамана я больш не вярнулася, бо надта вялікую цану заплаціла за яго калецтва.

З пашанай,
Ганна Сцяпанаўна

Да друку падрыхтавала
Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Досуг

Рождественские встречи в клубе «Надежда»

В уютном зале Слонимского РДК за празднично накрытыми столами слонимские дедушки и бабушки обменивались поздравлениями с Новым годом и Рождеством, делились своими планами, советовались, вспоминали прошлое.

Состоялись эти «Рождественские встречи» 13 января в клубе «Надежда» при участии сотрудников местного центра соцзащиты населения. На мероприятие были приглашены люди пожилого возраста.

Душевными песнопениями их порадовали семинаристы Минской духовной семинарии из Жировичей. А сколько задора и азарта придали встрече песни колядовщиков народного вокального ансамбля песни «Славяночка» из деревни Костровичи. Конечно же, посетили праздник Дед Мороз и Снегурочка. Не обошлось без Бабы Яги и добродушного волка на роликах.

На мероприятии участники клуба представили присутствующим карнавальные костюмы, сделанные своими руками. За это они были награждены призами.

Участники «Рождественских встреч» искренне радовались празднику, смеялись и веселились от души, пели и танцевали. Все выглядели нарядными и бодрыми.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора



Веселились слонимчане от души

Тот, кто добр, — свободен, даже если он раб; тот, что зол, — раб, даже если он король.
Аврелий Августин (354-430), епископ Гиппонский, философ

Дэтэктыўная аповесць

Загадкавы храм


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

**Заканчэнне
Пачатак у №№ 38-52 2010 г., №№ 1-3**

Барысу Казіміравічу здалося, што ляціць у пекла, дзе чэрці з віламі яго зачакаліся. Батура канешне, прызнаецца на допыце, хто яго падбухторыў забіць Сяргея. Святлану арыштуюць як саўдзельніцу. Потым будзе суд. Веру выклічуць як сведку. І яму, магчыма, позву прышлюць. Ганьба на ўвесь горад! Бізнэс у сінім агні згарыць!

— Як ты дайшла да гэтага? — усклікнуў Менкін, забыўшыся, што і сам планаваў забіць Батуру.

— Вось так і дайшла! З-за дачкі! Каб ёй спакойна жылося! Ты Веру не шкадуеш! Мне прыходзіцца яе шкадаваць! — мацней усхліпнула Святлана Іванаўна.

— Ты ж разам з Батурам у турму сядзеш!

— Не хвалюйся, Менкін! Нас у розныя камеры пасадзяць.

Барыс Казіміравіч нагнуўся над жонкай і сам усхліпнуў:

— Светачка, ты плачаш?

Святлана Іванаўна прагаварыла як моцна хворая:

— Менкін, сваю сям'ю ратуй!

— Як?

— Батуру з турмы выцягні.

«Трэба паспрабаваць!» — бы ў сне, падумаў Барыс Казіміравіч.

«НЕ АБЯЦАЮ»

Менкін прыехаў да Ашота. Ён ведаў, што ў гэтага армяніна ёсць «плечы» ў сталіцы.

Як і мінулы раз, Ашот у адных шортах сядзеў на верандзе і піў чай, а каля вішань, дзынькаючы, кружыліся пчолы.

— Ашот, майго лепшага сябра Батуру ў турму пасадзілі! Чуў? — здалёку пачаў Барыс Казіміравіч.

— Чуў, — варухнуўся на крэсле армянін.

Менкін цмокнуў губамі, каб паказаць, як моцна шкадуе ён палкоўніка.

— Добры чалавек, а пасадзілі!

— Залаты чалавек! — падтакнуў Ашот.

Барыс Казіміравіч уздыхнуў.

— Трэб выцягнуць яго з турмы.

Армянін адставіў убок кубачак з чаем.

— Сталічныя хлопцы яго ўзялі. А разам з ім і сяржанта.

Менкін скрывіўся. Немалую суму прыйдзецца выкласці за палкоўніка і сяржанта. Канешне, Батура потым верне даляры. Не з бедненькіх. Але гэта будзе потым. Пакуль свае трэба аддаваць.

— Ашот, я разумею!

Армянін пазногцямі паскроб па валасатых грудзях.

— Барыс Казіміравіч, не абяцаю. Цяжкія часы.

«ЛІЧЫЛЬНІК УКЛЮЧАНЫ»

На гэты раз Аксана прыйшла да Сяргея дамоў і заявіла:

— Лічыльнік уключаны!

— Які лічыльнік? — спачатку не зразумеў Гераська.

— Я да знаёмых хлопцаў звярнулася, паскардзілася ім, што даляры не аддаеш. Дык яны мне сказалі, каб перадала табе, што з працэнтамі аддасі.

Сяргей з нянавісцю паглядзеў на былую аднакласніцу. «Аддасі»... Як быццам яна зарабіла, а ён пазычыў у яе. А дзе іх узяць? Да Святланы Іванаўны ісці? Кілера найме, як Батура наняў. Заб'юць і закапаюць як сабаку. Адзін раз пашанцавала. Можа, забіць яе, каб не чаплялася? Зашморгай задушыць. Трэба. За горадам, у бярозавым гаёчку.

Гераська кашлянуў у кулак.

— Заўтра грошы дастану. Давай сустрэнемся на Шчары, каля бярозавага гаёчка. Там і аддам.

Аксана, было відаць, насцярожылася.

— У лес мяне цягнеш?

— Аддам і замочым. Я добрага віна куплю.

Дзяўчына наморшчыла нізенькі лабок і сказала:

— Я згодная. У колькі гадзін сустрэнемся?

— У дзевяць, — спакойна прамовіў Сяргей.

ПРАПАНОВА

У гэты дзень Вера патэлефанавала Апановічу і прапанавала яму:

— Андрэйка, давай заўтра раніцай на Шчару з'ездзім. Ты вудачку возьмеш. Магчыма, некалькі плотачак зловім.

— Давай, — пагадзіўся Андрэй. — У дзевяць гадзін каля бярозавага гаёчка буду чакаць.

СТАРЫЯ ЗНАЁМЫЯ

Андрэй прыехаў на Шчару ў восем гадзін. Там ужо сядзелі старыя знаёмыя: аператыўнікі Мікола і Антон.

— Добры дзень, дэсантнік! — прывітаўся Антон.

— Добры дзень, хлопцы, — адказаў Апановіч і, сеўшы на беразе, надзеў на кручок чарвяка і закінуў лёску ў рэчку. Як і мінулы раз, рыба не клявала.

«У бярозавы гаёчак схаджу, пралесак Веры нарву», — вырашыў ён і накіраваўся ў бярозавы гаёк.

У НАСТРОІ

Антон і Мікола былі ў добрым настроі.

— Удалася наша камандзіроўка! — сказаў Антон, правёўшы вачыма Андрэя.

— І вусаты, і Батура ў камеры сядзяць. Ёсць нітачка, за якую можна ўхапіцца, каб увесь клубок разблытаць, — прамовіў Мікола.

Антон з сілай стукнуў кулаком па траве.

— Я б такіх гадаў!..

— Цішэй, без эмоцый, аператыўнік. Давай сходзім у бярозавы гаёк. Паглядзім, як лес вясною жыве, — прапанаваў Мікола.

— Я не супраць, — пагадзіўся Антон.

КРЫК

Прывёўшы Аксану на ўскраек бярозавага гаёчка, Сяргей стрэсянуў поліэтыленавы пакет.

— Аксанка, вінца вып'ем, а потым я расплачуся з табою.

Аксана пакруціла галавою.

— Спачатку даляры аддай.

— Няхай будзе па-твойму. — Гераська паклаў пакет каля куста, засунуў руку ў кішэню і ўсклікнуў: — Глянь! Вунь вавёрка сядзіць! Ды такая прыгожая!

— Дзе? Дзе? — задрала галаву Гераськава аднакласніца.

— Вунь на той бярозцы!— прагаварыў Сяргей і, выняўшы з кішэні зашмаргу, накінуў яе на шыю дзяўчыне.

— А-а-а! — закрычала Аксана.

ДАПАМОГА

Гераська не бачыў, што непадалёку ад яго быў Андрэй. Пачуўшы Аксанін крык, ён кінуўся на ўскраек ляска.

Сяргей з усёй сілы сціскаў зашмаргу, а Аксана не давалася. Яна паспела ўхапіцца рукамі за гэтую вяроўчыну.

— Гад! — галёкнуў Андрэй, падбегшы бліжэй.

Гераська выпусціў зашмаргу і павярнуўся да яго.

— Дэсантнік?

— Гад! — паўтарыў Апановіч.

З поліэтыленавага пакета Сяргей выхапіў невялікую сякерку, якую, як гаворыцца, захапіў на ўсякі выпадак, для падстрахоўкі, і ўзняў над галавою.

— Засяку!

— Дапамажыце! — закрычала Аксана.

З-за куста выскачылі Антон і Мікола з пісталетамі ў руках.

— Рукі ўгору! — скамандаваў Антон.

Гераська падняў угору рукі і кінуў сякерку.

— Нездарма ў камандзіроўку мы прыехалі. Яшчэ раз пашанцавала нам, — сказаў Мікола.

— Вы мяне ў адну камеру з вусатым пасадзіце? — усклікнуў Сяргей.

Мікола наблізіўся да яго і патрос пісталетам.

— Хутка ён цябе сустрэне!

Гераська заморгаў вачыма і заплакаў, спадылба пазіраючы на Андрэя.

Андрэй хацеў яму сказаць, каб трымаўся з годнасцю, не разводзіў сырасць, але перадумаў: махнуў рукою і таропка пакрочыў.

ЁН

Апановіч моўчкі ішоў па залітым сонцам лузе. Неўзабаве ён сустрэнеца з Верай, а заўтра ў падзямеллі параіцца з продкамі, што яму рабіць далей.

Аляксей ЯКІМОВІЧ

НА ОЗЕРЕ ЮБИЛЕЙНОМ ОБНАРУЖЕН КОНЬ-БОМЖ

Пользователь гродненского форума “бабушка живущая в сети” увидела на озере Юбилейном близ Гродно неопрятного коня, который питался отходами жизнедеятельности человека из мусорных баков.

Конь поедает пакеты, всякую дрянь, его шерсть вся в катышках, скомкана, а глаза до ужаса грустные, пишет “бабушка живущая в сети”.

Она же задается вопросом, есть ли в Гродно какие-нибудь объединения по охране животных, куда можно обратиться? И что вообще можно сделать в этой ситуации? Ведь лошадь — это не кот и не собака…

Блог Гродно s13

ВОЙДИ В ИСТОРИЮ СВОЕГО ГОРОДА

В жизни каждого человека случаются как радостные, так и горестные события. Ведь именно из них и складывается хроника нашей жизни, которая может быть интересна не только нам, но и нашим потомкам.

Поэтому давайте вместе создавать историю нашего Слонима.

Если вы хотите, чтобы издание «Отдушина» написало о вашей свадьбе, рождении ребенка, известило о смерти ближнего и напечатало некролог под рубрикой "Войди в историю своего города", пишите нам по адресу:

г. Слоним, ул. Красноармейская, 41,

тел.: 612-26-43, 5-09-27 (тел/факс).

Поздравляем Дмитрия и Кристину



Дмитрию и Кристине найти друг друга помог их общий знакомый. Первая встреча молодых людей произошла на дискотеке в деревне Костровичи Слонимского района. Кристина живет в деревне Сеньковщина, а Дмитрий на встречу с девушкой приехал из Слонима. Кристина в то время еще училась в школе, а Дмитрий вернулся из армии и работал. Они оба понравились друг другу в первый день знакомства.

Встречались, дружили, а однажды Дмитрий решил сделать предложение своей любимой.

— **Дима пришел ко мне и предложил мне стать его женой. Я согласилась. Мы счастливы и мечтаем прожить вместе долго, весело и радостно,** — поведала Кристина.

15 января в Слонимском отделе ЗАГС состоялась торжественная регистрация Дмитрия Давидюка и Кристины Черкас. В этот день молодожены надели кольца верности и стали мужем и женой. Для них звучала музыка, им дарили цветы и поздравления.

— **Желаем дочери всего самого хорошего, счастья, здоровья, благополучия, удачи, любви и взаимопонимания. Всего им самого светлого, что есть на земле, чтобы не забывали своих родителей,** — пожелали Наталья Владимировна и Игорь Викторович, родители Кристины.

Счастья, любви, здоровья и взаимопонимания пожелала родному брату сестра Дарья.

А Дмитрий, родной брат Кристины, пожелал молодоженам много счастья, здоровья, тепла, достатка и любви.

Добро пожаловать, Милена!

Наталью и Сергея Мороз можно поздравить с пополнением в семействе. 12 января в 18 часов у них родилась дочь. Ее вес — 4 кг 50 г, рост — 53 см. Настоящая богатырка! Нарекли родители свою маленькую дочурку Миленой.

В семье Натальи и Сергея есть старший сын, которому семь лет. В день выписки он с папой, дедушкой и тетей Юлей встречал маму с сестричкой в выписной комнате Слонимского родильного дома.

— **Я желаю сестричке, чтобы росла большой, не плакала, чтобы быстрей подрастала и играла со мной,** — пожелал братик.

Глава семейства тоже рад такому прекрасному пополнению. Он пожелал жене и дочке здоровья.

— **Пушть внученька растет здоровенькой, радует нас и удивляет успехами, а я, чем смогу, буду помогать,** — пообещал дедушка Иван Владимирович.



Страница подготовила Анна ВОЛОДАЩУК
Фото автора

Главный редактор Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК

Учредитель Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Телефоны редакции:
МТС: 8-029-584-87-32
Velcom: 8-029-133-04-21
факс: 8 (01562) 5-09-27
звонить с 9.00 до 18.00

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним-9, а/я 32
Адрес редакции: ул. Коссовский тракт, 37, офис 16
Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Над номером работали:
журналисты: Екатерина ЯНУШЕВИЧ, Анна ВОЛОДАЩУК
фотокорреспондент Татьяна ПЛАХЕТКО
дизайнер Владимир КОЧЕРГА
стиль-редактор Жанна ПЛЕШКО

Авторы опубликованных материалов отвечают лично за подбор и достоверность фактов, их точка зрения может не совпадать с мнением редакции. Редакция не ведет переписки с читателями и оставляет за собой право не рецензировать и не возвращать рукописи. Редакция не несёт ответственности за содержание рекламы.

Тираж номера **3250** экз.

Время подписания к печати по графику 18 января 2011 года 11:00

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА
8-(044) 715-90-03
8-(044) 762-48-39
Павильон № 88, рынок «Коссовский»

Объем — два условных печатных листа.
Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4.
Заказ № 331

Свободная цена

ISSN 1991-3362
9 771991 336003

Регистрационное свидетельство №65 от 5 марта 2009 года выдано Мин. информации РБ. Лиц. №42540/0418481 от 27.05.08 до 25.06.13 Слонимский РИК